## АД РЭДАКЦЫІ

## ОТ РЕДАКЦИИ

## EDITORIAL

У 2025 г. юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адзначае 100-гадовы юбілей. З гэтай нагоды мне вельмі прыемна вітаць і віншаваць нашых паважаных студэнтаў, выпускнікоў розных гадоў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта, добрых сяброў, без супрацоўніцтва з якімі факультэт не выглядаў бы так годна.

Юрыдычны факультэт – гэта важная частка нашага жыцця. На ім мы набылі выдатную прафесію, сфарміравалі характар і актыўную грамадзянскую пазіцыю, адчулі энергію маладых сэрцаў, знайшлі лепшых сяброў, спазналі першае каханне!

Нам пашчасціла быць нашчадкамі законатворцаў, аўтараў небывалага ўзроўню Сярэдневякоўя, нашчадкамі вялікай гісторыі і помнікаў права.

Статуты Вялікага Княства Літоўскага – першыя канстытуцыі, якія былі надрукаваны на старабеларускай мове, мелі вялікае значэнне для фарміравання агульнаеўрапейскай і сусветнай прававой думкі. У іх упершыню ў гісторыі на такім узроўні гарантаваліся правы ўсіх жыхароў. Асобна ў статутах замацоўваліся правы жанчын, ім надавалася права мець маёмасць, прызначалася смяротнае пакаранне за згвалтаванне жанчыны. За злачынствы ў адносінах да нацыянальных і рэлігійных меншасцей прадугледжвалася такое ж пакаранне, як за злачынствы ў адносінах да вышэйшых саслоўяў. У шэрагу артыкулаў статуты замацоўваюць за пушчамі статус прыродных тэрыторый з асобай аховай. Некаторыя жывёлы, птушкі ахоўваюцца як асаблівая прыродная каштоўнасць.

Нашы продкі пакінулі пасля сябе багатую спадчыну, якой мы карыстаемся і ганарымся. На Беларусі ніколі не было рабства. Здаецца, што гэта асаблівасць і сёння мае вялікі ўплыў на гістарычнае, культурнае і рэлігійнае развіццё грамадства.

Адзін юрыдычны факультэт – гэта толькі структурная адзінка, а ўсе факультэты і інстытуты разам утвараюць Універсітэт, у якім навучаецца больш за 30 тыс. студэнтаў.

Для чалавека сто гадоў – гэта сталы ўзрост, але факультэт заўсёды застаецца маладым. Калі мы ўсе разам, наш сярэдні ўзрост ніколі не перавышае 22 гады.

Сто гадоў для факультэта – гэта перыяд для росквіту магчымасцей і дасягнення новых вышынь пры захаванні і памнажэнні слаўных традыцый.

У юбілейныя дні мы звычайна падводзім вынікі. У жыцці нашай альма-матар былі перыяды ўздымаў і цяжкія часы: стваралася юрыдычная школа і адбываліся рэпрэсіі, грымела вайна, распадаўся СССР, будавалася незалежная дзяржава. Пры гэтым нашы выпускнікі, студэнты, выкладчыкі заўсёды аддана працавалі на карысць роднай краіны і абаранялі Айчыну. У нас могуць быць розныя погляды, адчуванні, пачуцці, але мы будзем адданымі сваёй краіне.

Я ўпэўнены, што самы важны вынік дзейнасці нашай альма-матар – гэта лепшыя студэнты, якія бачаць сваю будучыню менавіта ў нашай краіне, гэта вы, нашы выпускнікі, прафесіяналы з вялікай літары, выдатныя выкладчыкі, для якіх факультэт – гэта жыццё!

Выкладчыкі і студэнты Мінскага юрыдычнага інстытута стаялі ля вытокаў стварэння Мінскага падполля, былі ўдзельнікамі складаных аперацый, ліквідацыі ката беларускага народа – гаўляйтара В. Кубэ. Імёны А. А. Сакаловай, М. Б. Осіпавай, В. С. Жудро, многіх іншых патрыётаў упісаны залатымі літарамі ў гісторыю факультэта, нашай краіны і ніколі не будуць забыты.

На юрыдычным факультэце БДУ пасля ўсіх нягод і ліхалецця Вялікай Айчыннай вайны склаўся

ўнікальны прафесійны калектыў найвышэйшага ўзроўню, у які ўвайшлі такія вядомыя навукоўцы, як А. А. Галаўко, І. І. Гарэлік, В. А. Дарогін, С. Р. Драбязка, І. М. Ігнаценка, С. В. Курылёў, А. Ц. Лейзераў, Я. А. Мацвіенка, М. М. Меркушаў, Г. А. Павецьеў, В. В. Сарокіна, В. Ф. Чыгір, В. А. Шкурко, В. М. Шпілёў, М. Р. Юркевіч, І. А. Юхо і інш.

Ужо ў час навейшай гісторыі, пасля Вялікай Айчыннай вайны, яны заклалі неразбуральны падмурак нашага факультэта. Сёння і заўсёды гэтыя навукоўцы застаюцца з намі.

Вельмі прыемна выказаць падзяку замежным сябрам, якія знаходзяць магчымасць прыняць актыўны ўдзел у нашых навуковых, адукацыйных мерапрыемствах, праектах і ўрачыстасцях.

Ад усяго сэрца віншую нас з такім слаўным юбілеем і выказваю шчырую падзяку калектыву факультэта за адданую працу, а юрыдычнаму супольніцтву – за падтрымку і разуменне!

Жадаю ўсім нам поспехаў у прафесійнай дзейнасці, асабістага шчасця, дабрабыту, любові і кахання! Спадзяёмся, што нашы дзеці і ўнукі таксама выберуць для сябе юрыдычны факультэт БДУ!

З Днём нараджэння, родны юрыдычны факультэт!

***С. А. Балашэнка***[1]

[1]*Сяргей Аляксандравіч Балашэнка* – доктар юрыдычных навук, прафесар; прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Сергей Александрович Балашенко* – доктор юридических наук, профессор; профессор кафедры экологического и аграрного права юридического факультета Белорусского государственного университета.

*Siarhei A. Balashenko*, doctor of science (law), full professor; professor at the department of environmental and agrarian law, faculty of law, Belarusian State University.

E-mail: *balashenko@bsu.by*